## Векапомнае

# ПАРТЫЗАНСКІ СУВЯЗНЫ

Ён жыве ў вёсцы Мелкавічы, якую ад галоўнага мазуршчынскага шляху аддзяляе ціхая і спакойная Случ. Кожную раніцу Лявон Кандратавіч выходзіў да ракі, садзіўся ў човен і пераправляўся на правы бераг. Тут жа непадалёку, на высокім пясчаным узгорку, стаяў будынак медпункта. З навакольных вёсак сюды прыязджалі і прыходзілі людзі. І вясковы фельчар лячыў іх як толькі мог: дапамагаў і лякарствамі, і душэўнымі словамі.

Любілі людзі мазуршчынскага фельчара Лявона Кандратавіча Бычэню за чуласць, цеплыню і ўвагу. Добрыя весткі разносілі аб ім па палескіх вёсках.

І вось зямлю і людзей апаліла полымя вайны. Не павесіў замок на дзверы Лявон Кандратавіч, не закрыў медпункт. Ён ведаў, што яго дапамога людзям патрэбна і цяпер, можа нават больш, чым раней.

Да фельчара ішлі хворыя, ішлі з блізкіх і далёкіх вёсак. Лявон Кандратавіч з кожным вёў гутарку, умела накіроўваў яе і аб многім даведваўся.

Сабраўшы патрэбныя звесткі, фельчар ноччу на ўзрэччы прымаў партызанскіх разведчыкаў і многа чаго ім расказваў: калі і дзе збіраюцца акупанты хапаць моладзь, каб вывезці яе на катаргу ў Германію, дзе рыхтуецца карная экспедыцыя і многае інш.

Калі разведчыкі не прыходзілі, ноччу садзіўся на човен і ціха плыў уніз па Случы да ўмоўленага месца, дзе была назначана сустрэча з партызанамі. А колькі разоў ён перавозіў іх з аднаго берага на другі!

У маі 1942 года Лявон Кандратавіч паведаміў нам партызанам, што па мазуршчынскім шляху ў суправаджэнні эсэсаўцаў ездзіць аўтамашына з палявой поштай. Возяць яе са Слуцка ў Лунінец. Ён перавёз 1[illegible] чалавек партызан пра[з] Случ, і мы насупраць вёскі Заглінная залеглі ў засаду. Паказалася аўтамашына. Грымнуў дружны партызанскі залп—і машына збочы[ла] з дарогі. 13 акупантаў знайшлі сабе магілу. Мы захапілі зброю, каштоўную палявую пошту, а машыну спалілі.

Я прывёў толькі адзін эпізод. Іх была многа. Памятаецца, як Лявон Кандратавіч дапамог групе байцоў разам з генералам Канстанцінавым адбіцца ад праследавання гітлераўцаў і паліцаяў і ўглыбіцца ў лясныя масівы. Гэта было ў снежні 1941 года.

Летам 1942 года з яго дапамогай партызанскай разведчыцы ўдалося звязацца з групай былых воінаў, якіх прымусова заставілі пайсці ў паліцыю. Мікалай Каробін, Сяргей Радзін і Міша Харольскі перабілі паставых з банды Далматовіча Логвіна і, захапіўшы зброю, перайшлі да партызан.

У многіх партызанскіх атрадах добра ведалі фельчара, дзядзьку Лявона. Яго служэнне вялікай справе ў цяжкія гады Вялікай Айчыннай вайны— яшчэ адзін доказ вялікай адданасці савецкіх людзей сваёй Радзіме, партыі, справе вялікага Леніна.

**У. ШОШЫН,**
**былы разведчык Пінскага партызанскага злучэння.**